WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛЮТАГА 2011 г. ПЯТНІЦА № 27 (26891)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Прамая лінія**

**БЕЗ НЕЎРЫТАЎ, НЕЎРАЛГІЙ І РАДЫКУЛІТАЎ**

Тэмай нашай чарговай «прамой лініі» стануць пытанні лячэння і прафілактыкі хвароб неўралагічнага профілю: радыкуліту, неўрытаў, неўралгій, сасудзістых захворванняў галаўнога мозга і г.д. Чытачам будзе адказваць **загадчык неўралагічнага аддзялення мінскай 10-й гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Віктаравіч ІВАНОЎ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **17 лютага, у чацвер з 17.00 да 18.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

**У СУБОТУ, 12 ЛЮТАГА, у нашай краіне свята:**

**НАВАБРАНЦЫ ПРЫМАЮЦЬ ПРЫСЯГУ**

У заўтрашнім нумары чытайце эксклюзіўнае **інтэрв'ю міністра абароны Рэспублікі Беларусь Юрыя ЖАДОБІНА** газеце «Звязда» **«Народнай арміі салдаты»**.

## ПРАБЛЕМА НЯХВАТКІ ПЕДЫЯТРАЎ У БЛІЖЭЙШЫЯ ГАДЫ БУДЗЕ ВЫРАШАНА

**Аб гэтым заявіў падчас online-канферэнцыі на сайце БЕЛТА міністр аховы здароўя Васіль Жарко.**

Дэфіцыт педыятраў будзе ліквідаваны дзякуючы павелічэнню набору на педыятрычныя факультэты Беларускага і Гродзенскага дзяржаўных медыцынскіх універсітэтаў. Міністр нагадаў, што ва ўстановах аховы здароўя нядаўна ўведзена новая спецыяльнасць — памочнік урача (фельчар). Частку ўрачэбных функцый яны бяруць на сябе, знімаючы тым самым нагрузку з урача.

Васіль Жарко лічыць немэтазгодным даваць камерцыйным медцэнтрам права на выдачу бальнічных. Ён падкрэсліў, што ў дзяржустановах аховы здароўя наладжаны строгі кантроль за выдачай лісткоў непрацаздольнасці. Прычым не ў плане іх абмежавання, а ў плане правільнасці і аб'ектыўнасці іх выдачы. Дарэчы, дадаў міністр, калі недзяржаўным медыцынскім цэнтрам прапанавалі ўзяць на медабслугоўванне пэўную долю насельніцтва ў рамках бюджэтнага фінансавання на аднаго жыхара, то яны адмовіліся — ім гэта нявыгадна.

## БІЗНЭС — ЗА СТВАРАЛЬНЫ КАНТРОЛЬ

### Камітэт дзяржаўнага кантролю правёў першы «круглы стол» з бізнэс-суполкай краіны ў рамках выканання Дырэктывы №4

**Такія сустрэчы стануць рэгулярнымі як у цэнтральным Камітэце, так і ў абласных. Іх мэта — адкрыты дыялог паміж дзяржкантролем і прадстаўнікамі бізнэсу для папярэджвання правапарушэнняў у эканамічнай сферы краіны, ліквідацыі прычын і ўмоў, якія такім правапарушэнням садзейнічаюць.**

10 лютага ў рабоце «круглага стала» ўдзельнічалі ўсё кіраўніцтва галоўнага кантрольнага ведамства краіны, прадстаўнікі Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Міністэрства па падатках і зборах, Міністэрства эканомікі, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Бізнэс-суполку прадстаўлялі дырэктары шэрагу прадпрыемстваў і прадстаўнікі бізнэс-саюзаў, а таксама ўдзельнікі Працоўнай групы экспертаў па падрыхтоўцы плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы №4 ад 31 снежня 2010 года. Размова доўжылася тры гадзіны замест запланаваных двух, была сапраўды адкрытай і канструктыўнай.

У самым пачатку сустрэчы старшыня Камітэта дзяржкантролю папярэдзіў, што ад прадстаўнікоў бізнэс-эліты хацелася б пачуць не толькі прапановы па стварэнні спрыяльных умоў для прадпрымальніцкай дзейнасці, хоць, гэта, магчыма, самае галоўнае, але чакаюцца і прапановы па пад'ёме аўтарытэта прадпрымальніцтва.Тым самым Аляксандр Якабсон закрануў за «жывое». Пытанне аўтарытэту, аказалася, вельмі хвалюе і саміх бізнэсоўцаў.

Так, ценявая эканоміка ў краіне існуе, і бізнэс-суполка не менш за дзяржаву зацікаўлена ў тым, каб увесь айчынны бізнэс быў легальны і празрысты. Таму так важна, пагаджаліся і чыноўнікі, і прадпрымальнікі, супрацоўнічаць, а не супрацьстаяць адно аднаму. Адну з галоўных прэтэнзій прадпрымальнікаў да кантралёраў можна рэзюмаваць як «настрой на парушэнне». Якраз гэты момант павінен быць хутка выкаранены, калі меркаваць па заявах Камітэта дзяржкантролю і новых формах яго работы.

— Дырэктыва №4 з'яўляецца праграмным дакументам, які накіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для прадпрымальніцкай дзейнасці і павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, — сказаў Аляксандр Якабсон. — На гэта накіравана і работа па ўдасканаленні кантрольнай дзейнасці, якая павінна насіць не столькі каральны, колькі прэвентыўны характар.

Пытанні праверак суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці рэгулююцца Указам кіраўніка дзяржавы №510. Гэты дакумент стаў першым заканадаўчым актам, які стварыў адзіныя прававыя ўмовы для правядзення планавых і пазапланавых праверак як кантралюючымі, так і нагляднымі органамі. Указ паказаў сваю эфектыўнасць: за два гады колькасць праверак фінансава-гаспадарчай дзейнасці скарацілася ўдвая. Аднак пры скарачэнні агульнай колькасці праверак, заўважыў старшыня Камітэта, колькасць наглядных праверак застаецца высокай, і сёння вядзецца работа па пераглядзе метадаў і форм работы наглядных органаў.

— Для таго, каб пабудаваць рэальную шматукладную эканоміку, трэба, каб людзі не баяліся займацца бізнэсам, — выказаў сваё меркаванне старшыня ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў» Аляксандр КАЛІНІН. — На жаль, у нас стварыўся надта рэпрэсіўны ўхіл штрафнога заканадаўства. Страшныя не самі праверкі, а іх наступствы.

Прадстаўнікі бізнэсу падчас «круглага стала» казалі пра тое, што пакаранне не павінна прыводзіць да гібелі прадпрыемства, што кожны чалавек мае права на памылку, што перш чым караць, трэба растлумачыць, навучыць і папярэдзіць. Што настрой кантралёраў пры кожнай праверцы знайсці парушэнне прыводзіць да злоўжыванняў і абсурду.

Што тычыцца ценявой эканомікі і лжэпрадпрымальніцтва, то ўдзельнікі «круглага стала» пагадзіліся, што гэтай тэме трэба прысвяціць асобную размову, бо важна зразумець прычыны, якія выклікаюць негатыўныя з'явы ў эканоміцы, каб выкараніць іх.

Кантроль у бізнэсе неабходны, гэта элемент менеджменту, пагаджаліся прадпрымальнікі з арганізатарамі сустрэчы. Але кантроль павінен быць не татальны, а стваральны, накіраваны не на знішчэнне, а на выпраўленне і дапамогу.

Прадстаўнікі бізнэс-эліты віталі «круглы стол» пад эгідай Камітэта дзяржкантролю і прапаноўвалі пайсці далей — стварыць сумесны кансультатыўны орган, які акумуляваў бы праблемныя пытанні ў бізнэс-сферы і выпрацоўваў прапановы па іх вырашэнні для ўрада краіны.

Па выніках сустрэчы Аляксандр Якабсон даручыў Камітэту дзяржкантролю на працягу сутак унесці агучаныя падчас «круглага стала» канкрэтныя прапановы ў працоўныя групы па падрыхтоўцы плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы і ўнясення змяненняў і дапаўненняў ва Указ № 510.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## СТАЛІЧНЫЯ ПАСАЖЫРЫ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ**

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧПТУП «Несвиж коопзаготпром» (продавец)** проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: **г. Несвиж, ул. Ленинская, 126**, в составе: здания свинарника, об. пл. 1028,7 кв.м; здания летнего лагеря для свиней, об. пл. 720,6 кв.м; здания летнего лагеря для свиней, об. пл. 254,8 кв.м.

**Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 222 359 400 бел. руб.**

**Площадь земельного участка 1,6667 га.**

**Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Первое извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2009.

Аукцион состоится **18.02.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.02.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

## БЕЛАРУСЫ «КІНУЛІ» БОЛЬШ ЗА ТРЫЛЬЁН НА ЎКЛАДЫ

### Трэць ад гэтай сумы насельніцтва размясціла ў банках у нацыянальнай валюце

**Астатнія грошы, якія беларусы за месяц паклалі на дэпазіты, трэба меркаваць, былі выцягнуты з запасаў «пад падушкай», зробленых у замежнай валюце напярэдадні гэтага года, калі панаваў ажыятажны попыт на цвёрдаканверсоўную. Страсці і чуткі пра незайздросны лёс беларускага рубля суцішыліся, людзі супакоіліся, калі ўбачылі, што ніякіх непрыемнасцяў не здарылася, адсюль і істотнае павелічэнне зберажэнняў у банках. Каб зразумець, што студзень стаў сапраўды «ўраджайным» па аб'ёме прыцягнутых банкамі сродкаў насельніцтва, дастаткова згадаць, што за ўвесь мінулы год прырост дэпазітаў у рублях і замежнай валюце склаў 4,8 трыльёна рублёў у эквіваленце.**

Нягледзячы на тое, што даходнасць укладаў, няхай і марудна, але змяншаецца, працэнтныя стаўкі па іх сёння падтрымліваюцца на дастаткова высокім узроўні, каб не толькі зберагчы пакладзеныя на іх сродкі ад інфляцыі, але і даць прыбытак. Банкі па-ранейшаму прапануюць дастаткова выгадныя ўмовы размяшчэння грошай, прычым як на рублёвыя, так і на дэпазіты ў замежнай валюце. Разам з тым, працэнтная палітыка, накіраваная на падтрыманне цікавасці ўкладчыкаў менавіта да зберажэння сваіх сродкаў у нацыянальнай валюце, застаецца нязменнай: узровень працэнтных ставак рублёвых укладаў больш прывабны ў параўнанні з дэпазітамі ў СКВ: калі па першых некаторыя банкі налічваюць да 18 працэнтаў гадавых, то па валютных «столь» — 8 працэнтаў. Улічваючы, што сёлета абменны курс нацыянальнай валюты будзе трымацца ў межах плюс/мінус 8 працэнтаў (а кіраўнік Нацбанка, наогул, спрагназаваў, што ваганні курсу ў той ці іншы бок складуць сёлета не больш за 5 працэнтаў), зразумела, якім зберажэнням трэба аддаць перавагу.

Між іншым, па апошніх звестках Нацыянальнага банка, на замежную валюту цяпер насельніцтва якраз не вельмі і «западае»: няма ўжо ранейшага істотнага перавышэння куплі цвёрдаканверсоўнай над продажам. Як паведаміў карэспандэнту нашай газеты намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч, у параўнанні з папярэднімі месяцамі ў лютым на рынку наяўнай валюты сітуацыя кардынальна змянілася: за першы тыдзень беларусы прадалі на 14,3 мільёна долараў ЗША ў эквіваленце больш, чым купілі ў «абменніках» банкаў. Чысты продаж наяўнай валюты насельніцтвам штодня ў пачатку лютага складаў у сярэднім каля 2 мільёнаў долараў у эквіваленце. Згадаем, што ў студзені карціна была іншай: чысты попыт беларусаў на замежную валюту хоць і скараціўся ў параўнанні са снежнем 2010 года ў 11 разоў, але ўсё роўна фізічныя асобы купілі на 57 мільёнаў долараў больш, чым прадалі.

> **«Са 100 рублёў грашовых даходаў толькі каля 5 рублёў беларус кладзе ў банк».**

Што датычыцца ўкладаў насельніцтва ў беларускіх банках, то яны на пачатак лютага дасягнулі амаль 24 трыльёнаў рублёў. Дэпазіты ў нацыянальнай валюце за мінулы месяц узраслі на 332,4 мільярда рублёў, ці на 3,4 працэнта, а ў замежнай — на 206,7 мільёна долараў, ці на 4,7 працэнта. Такім чынам, на пачатак гэтага месяца ўклады грамадзян у нацыянальнай валюце складалі 10,1 трыльёна рублёў, у замежнай — амаль 4,6 мільярда долараў у эквіваленце.

Як адзначыў у гутарцы з нашым карэспандэнтам **эксперт газеты «Звязда», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**, рэйтынгавае агенцтва ўніверсітэта падвяло вынікі працы банкаў за мінулы год. Паводле звестак агенцтва, у сегменце дэпазітаў першыя два месцы як заўсёды за ААТ «Беларусбанк», які трымае амаль 53 працэнты ўкладаў фізічных асоб, і ААТ «Белаграпрамбанк» — больш за 11 працэнтаў. На трэцяе месца выйшаў ААТ «БПС-Банк», які ўжо мае больш за 9 працэнтаў. Чацвёртым ідзе «Пріорбанк» ААТ з больш як 7 працэнтамі, пятым — ААТ «Белінвестбанк», якому насельніцтва даверыла амаль 7 працэнтаў ад усіх укладаў. У наступнай пяцёрцы — філіялы расійскіх банкаў, якія таксама актыўна прыцягваюць грошы насельніцтва, і кожны з якіх мае больш за 1 працэнт усіх укладаў фізічных асоб.

Дарэчы, у крэдытаванні фізічных асоб бясспрэчным лідарам з'яўляецца ААТ «ААБ «Беларусбанк», паколькі праз яго выдаецца льготныя крэдыты на будаўніцтва жылля, і банк сёння мае амаль 70 працэнтаў крэдытаў насельніцтву.

— Тое, што за студзень уклады насельніцтва ў беларускіх банках прырaслі больш як на 1 трыльён рублёў у эквіваленце, — гэта, безумоўна, добры вынік, — кажа Міхаіл Кавалёў. — Аднак па-ранейшаму на кожнага беларуса ў банках на дэпазітах ляжыць крыху больш за паўтарамесячную зарплату: была зарплата 100 долараў — і ў банках у разліку на кожнага жыхара прыпадала прыкладна 150 долараў, сёння сярэдняя зарплата стала 500 долараў — у банках ляжыць на кожнага беларуса прыблізна па 820 долараў. Насамрэч норма зберажэнняў павышаецца не так ужо і хутка: са 100 рублёў грашовых даходаў толькі каля 5 рублёў беларус кладзе ў банк. У той час як заходнееўрапейскія жыхары навучаны зберагаць больш, адкладваць на «чорны дзень», на адпачынак, на вучобу дзяцей, на будаўніцтва жылля. Мы пакуль па-ранейшаму (калі ўспомніць савецкае мінулае) не вельмі думаем пра будучае, магчыма і зберагаць больш. Наша ж моладзь аддае перавагу наогул жыць у доўг. У студзені ўпершыню крэдыты, выдадзеныя насельніцтву на 23 трыльёны рублёў, зраўняліся з дэпазітамі фізічных асоб. Гэта значыць, фактычна ўсе грошы, якія банкі ўзялі ў насельніцтва, яны ж і аддалі насельніцтву. А гэта гаворыць пра тое, што прыкладна пятая частка банкаўскіх актываў працуе толькі на насельніцтва. Банк бярэ грошы ў адной яго часткі і аддае другой, што не на карысць для рэальнага сектара эканомікі. Таму што на пазычаныя ў банках сродкі насельніцтва купляе, у асноўным, імпартныя, а не беларускія тавары. Таму важна, што нядаўна Саўмін пашырыў спіс айчынных тавараў, для набыцця якіх можна браць ільготныя крэдыты. Гэта вельмі важны напрамак у дзейнасці банкаў, і яго неабходна актыўна развіваць. Ва ўсім свеце радуюцца, калі расце спажывецкі попыт, але радуюцца таму, што насельніцтва купляе айчынныя тавары. Я лічу, што ў нас перад банкаўскай сістэмай стаяць дзве праблемы: першая, якую трэба вырашаць у стратэгіі развіцця банкаўскай сістэмы на пяцігодку, што распрацоўваецца, — рэзкае павелічэнне нормы зберажэнняў; другая — рэзкае павелічэнне крэдытавання пакупкі айчынных тавараў. Таму што калі банкі крэдытуюць пакупку 20 тысяч аўтамабіляў, як летась, для эканомікі Беларусі гэта стварае толькі праблемы з валютай, плацежным балансам і знешнім доўгам.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Ні дня без нафты

**У наш век «энергазаклапочанасці» ўсе толькі і думаюць, што пра дыверсіфікацыю, альтэрнатыўныя крыніцы ды скарачэнне спажывання. Але пакуль супермагутную батарэйку не вынайшлі, а рэнтабельнасць узнаўляльных крыніц усё яшчэ выклікае сумненні, пры слове «нафта» ва ўсіх пачынае пачашчана біцца сэрца. І менавіта гэта сёння першым прыходзіць у галаву, калі гутарка ідзе пра супрацоўніцтва Беларусі з Іранам.**

Першая фаза сумеснай здабычы — да 15 тыс. барэляў штодня — на радовішчы Джафэйр ужо распачата. І як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі **пасол Ірана ў Беларусі Сеед Абдал ХАСЕЙНІ**, «цяпер размова ідзе пра адкрыццё другой фазы: тады будзе здабывацца каля 30 тыс. барэляў у дзень». Радовішчам Джафэйр сумесная нафтаздабыча можа не абмяжоўвацца. Пры наяўнасці такога жадання з беларускага боку, Іран гатовы вылучыць дадатковыя радовішчы, акцэнтуе дыпламат. Сумесна здабытае «чорнае золата» рэалізоўваецца праз сетку гандлёвага дома пры нафтагазавай кампаніі Ірана. Што да пастаўкі іранскай нафты ў Беларусь, то цяпер якраз абмяркоўваецца магчымасць іх ажыццяўлення па своп-схеме. «Баш на баш», так бы мовіць.

— У нас няма абмежаванняў па продажы нафты беларускім сябрам, — запэўнівае кіраўнік дыпмісіі, — трэба толькі знайсці схему, якая была б найбольш рацыянальнай эканамічна.

Абмяркоўваюцца, у прыватнасці, варыянты своп-схем з Расіяй і Азербайджанам, расказаў спадар Хасейні.

Хапае ў Беларусі з Іранам і іншых пляцовак для супрацоўніцтва. Напрыклад — інвестыцыйны сектар. Іран ужо рэалізуе ў нашай краіне праекты на агульную суму амаль 1,5 млрд долараў. Многія з іх на слыху. Той жа гасцінічна-дзелавы комплекс «Магніт-Мінск» ля Нацыянальнай бібліятэкі. Ці буйны транспартна-лагістычны цэнтр «Прылессе» ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск». Іранскімі намаганнямі ў беларускай сталіцы з'явіцца яшчэ адзін 5-зоркавы атэль.

Пасол адзначае зацікаўленасць Ірана ў далейшым развіцці інвестыцыйных сувязяў з Беларуссю. Сёння на стадыі абмеркавання знаходзіцца яшчэ шэраг сумесных праектаў. У перспектыве — з'яўленне цэлага турыстычнага комплексу ў раёне Заслаўскага вадасховішча. Ёсць задумы адкрыць вытворчасць дроту і цэментавы завод на Гомельшчыне. Плануецца таксама павялічыць продаж іранскіх лекаў у Беларусі.

Актывізацыі супрацоўніцтва, зразумела, спрыяюць непасрэдныя кантакты. І паводле інфармацыі пасла, ёсць верагоднасць, што сёлета Беларусь і Іран абмяняюцца візітамі на найвышэйшым узроўні.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## ЕХАЛА ЛЯЧЫЦЦА...

У Івацэвіцкім раёне «хуткая дапамога» звалілася ў кювет па дарозе ў райцэнтр, калі везла пацыентку ў бальніцу. 72-гадовая жанчына з пасёлка Целяханы спадзявалася атрымаць палёгку ў сваіх хваробах, але... І цяпер, акрамя старых дыягназаў, стан хворай ускладніўся ўдарам грудной клеткі, пераломам рабрыны і, вядома ж, стрэсам. На дарозе вадзіцель Івацэвіцкай раённай бальніцы не справіўся з кіраваннем.

**Яна СВЕТАВА.**

## РУЖЫ ДЛЯ МІКІЦІЧА

**Нефармат**

ПРА СІТУАЦЫЮ вакол французска-расійскай кампаніі «Данон-Юнімілк» на нашым рынку не выказаўся хіба толькі лянівы сродак масавай інфармацыі. Справа зараз на кантролі ў кіраўніка дзяржавы, таму ёсць падставы спадзявацца, што нашы вытворцы і перапрацоўшчыкі малака не будуць больш цярпець ад прыезджых інвестараў-гастралёраў. У многім гэта стала магчыма дзякуючы сталай і прынцыповай пазіцыі маленькага калектыву дагэтуль амаль нікому не вядомага Пружанскага малочнага камбіната. Гэта яны, працаўнікі, не маўчалі, не склалі рукі, не чакалі, пакуль прыйдзе з замежжа нейкі новы гаспадар і, мабыць, забяспечыць іх работай. Яны сталі біць ва ўсе званы, пісаць ва ўсе інстанцыі, збірацца на сходы — выказваць сваю пазіцыю. І іх пачулі.

Сёння калектыў пружанскага малакаперапрацоўчага прадпрыемства складаецца з 350 чалавек. А раней было 500, да прыходу ў 30-тысячныя Пружаны вышэйназванай замежнай кампаніі. І ў цэху, які набыў «Юнімілк», аказалася непатрэбным не толькі абсталяванне для глыбокай перапрацоўкі малака (яго разабралі і вывезлі на склад), сталі лішнімі многія людзі. Так, без працы засталіся некаторыя вадзіцелі, што збіралі малако па раёне. Ды што там вадзіцель ці лабарантка — на пэўным этапе лішнім аказаўся і дырэктар завода. А гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

Уладзімір Мікалаевіч Мікіціч узначаліў прадпрыемства з дзясятак гадоў таму. Да гэтага камбінату вельмі не шанцавала. Засланцы з Брэста, якія часта мяняліся, давялі яго, як той казаў, ледзь не да ручкі. І вось былы кіраўнік паспяховага сельгаспрадпрыемства крок за крокам за дзве пяцігодкі вывеў ААТ «Пружанскі малочны камбінат» у лік перадавых прадпрыемстваў малочнай перапрацоўкі Брэсцкай вобласці. Да таго ж у раёне Уладзімір Мікіціч — чалавек адметны і аўтарытэтны. Я памятаю Уладзіміра Мікалаевіча дваццаць гадоў таму, калі ён працаваў старшынёй калгаса імя Свярдлова Пружанскага раёна. Тады ён выдзяляўся сваім сталым мысленнем, а яшчэ інтэлігентнасцю. У той час многія здзіўляліся, як Мікіціч паспяхова кіруе калгасам: матам не лаецца, голас амаль не павышае, а справы ідуць лепш, чым ва ўсіх суседзяў? Вось і тады, відаць, стаўку рабіў найбольш на эканамічныя рычагі кіравання. Як і пазней, на камбінаце. І так, што па выніках работы за 2009 год быў прызнаны лепшым кіраўніком малака- і мясаперапрацоўчага прадпрыемства канцэрна «Брэстмясамалпрам».

Толькі гэта не перашкодзіла назіральнаму савету ААТ «Пружанскі малочны камбінат» два тыдні таму, 25 студзеня, вызваліць дырэктара ад пасады, якую той займаў. Нідзе не гаварылася, але ўсе ведалі пра тое, што дырэктар стаў перашкодай на шляху продажу кантрольнага пакета акцый камбіната кампаніі «Юнімілк». Вось і знялі, як лот з аўкцыёна, без тлумачэння прычын. Сказалі, што закон дае савету такое права. Як аказалася, закон дае права і адмяніць сваё рашэнне. І пасля нарады ў Прэзідэнта назіральны савет сабраўся зноў. Як вызвалялі, у сабакі вочы пазычыўшы — так, трэба думаць, і назад вярталі.

У тэлефоннай размове з карэспандэнтам «Звязды» Уладзімір Мікіціч сказаў, што ўсе пытанні наконт далейшага супрацоўніцтва з замежнай кампаніяй адкрытыя. Пратакол даручэнняў Прэзідэнта вельмі грунтоўны, над ім зараз працуюць у розных інстанцыях, будуць весціся перамовы і кансультацыі, а камбінат пакуль працуе ў папярэднім рэжыме, работы хапае.

— А праўда, што вас сустракалі вялізным бярэмам ружаў?

— Вой, толькі не варта пра гэта пісаць, стыхійны ўсплёск людскіх эмоцый.

А вось тут дазвольце не пагадзіцца, Уладзімір Мікалаевіч. Гэта не стыхійная, а хутчэй заканамерная праява эмоцый. Прычым не горшых эмоцый. Людзі адчулі, што яны не проста нейкія «вінцікі» ў вялікім безасабовым механізме, а яны — калектыў, які мае права на сваё меркаванне і можа быць пачутым. Яны святкавалі перамогу справядлівасці і здаровага сэнсу. І за іх можна парадавацца. Засмучае другое.

Каб не дайшла ўся гэтая гісторыя да самага верху, невядома, чым скончылася б. А колькі яшчэ такіх дырэктараў, якіх звальняюць па нечай злой волі, па несупадзенні інтарэсаў, па нейкіх іншых прычынах, акрамя прамых інтарэсаў вытворчасці? А калектывы не валодаюць такой ступенню грамадзянскай сталасці, каб сказаць сваё важкае слова ў абарону. Не валодаюць, не ўмеюць... застаецца адно — вучыцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## МІНЮСТ ПРАПАНОЎВАЕ КАНФІСКОЎВАЦЬ ПАСВЕДЧАННІ КІРОЎЦЫ Ў ДАЎЖНІКОЎ-«УХІЛІСТАЎ»

**Аб гэтым плануемым новаўвядзенні (і не толькі) карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве юстыцыі Беларусі.**

Мінюст прапаноўвае даўжнікоў, якія наўмысна ўхіляюцца ад рашэння агульных судоў, часова абмяжоўваць у некаторых правах.

— Не сакрэт, што не ўсе грамадзяне, якія маюць доўг, своечасова выконваюць судовыя рашэнні, — адзначыла **начальнік Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі Ганна ШПАК**. — Асобныя з іх наўмысна хаваюць сваю маёмасць, даходы, не жадаюць працаваць, пры гэтым жывуць прыпяваючы і раз'язджаюць на шыкоўных машынах. Каб нейкім чынам паўплываць на такіх «ухілістаў», мы лічым мэтазгодным часова (да выканання даўжніком сваіх грашовых абавязацельстваў. — **Н. Д.**) абмяжоўваць іх права на паляванне, канфіскоўваць пасведчанні кіроўцы. Але гэта не значыць, што пасведчанне будуць забіраць у кожнага даўжніка. Не. Новаўвядзенне, як нам бачыцца, будзе прэвентыўнай мерай, якая прымусіць грамадзяніна задумацца і своечасова выканаць свае абавязацельства.

Зараз праект закона, які карэкціруе Грамадзянскі працэсуальны кодэкс, знаходзіцца на стадыі ўзгаднення. Што ж тычыцца ўвядзення крымінальнай адказнасці ў адносінах даўжнікоў -«ухілістаў», то разгляд гэтага пытання спынены.

— Справа ў тым, што падрыхтаваны законапраект не знайшоў падтрымкі ва ўсіх зацікаўленых ведамствах, — патлумачыла Ганна Шпак. — Але я не выключаю таго, што з часам мы вернемся да разгляду гэтага пытання.

### Работа над распрацоўкай канцэпцыі ювенальнай юстыцыі не спынена

У шэрагу еўрапейскіх краін дзейнічаюць спецыяльныя суды для непаўналетніх.

— Ювенальныя суды, мяркуецца, у будучым з'явяцца ў Беларусі, — кажа Ганна Шпак. — Калі дакладна, сказаць складана, бо гэта працаёмкі працэс. Перш чым зацвердзіць канцэпцыю на заканадаўчым узроўні, трэба ўстанавіць сферу адказнасці кожнага зацікаўленага дзяржоргана. Мы зараз працягваем вывучаць міжнародны вопыт па гэтым пытанні. Вельмі важна, каб дзіця, якое аступілася ў сілу жыццёвых абставін альбо з-за канфліктаў з бацькамі, не згубілася на якой-небудзь стадыі судовага працэсу. І ў дачыненні да яго была прынята санкцыя, якая паспрыяе найбольш хуткаму і эфектыўнаму выпраўленню, перавыхаванню.

### «Бясспрэчныя справы павінны разглядаць натарыусы»

Праект нарматыўна-прававога акта з такой прапановай зараз рыхтуецца ў Міністэрстве юстыцыі.

— Разгляд бясспрэчных спраў (напрыклад, па запазычанасці па аплаце за кватэру, па маёмасці, узятай напракат), якія сёння разглядаюцца ў парадку загаднай вытворчасці, плануецца ўскласці на натарыусаў, — паведаміла Ганна Шпак. — Гэтае новаўвядзенне дапаможа разгрузіць суды і тым самым аптымізаваць іх работу.

### Калі ў Беларусі можна будзе плаціць падаткі, не выходзячы з дому?

Як паведаміў **начальнік Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы эканомікі і экалогіі Міністэрства юстыцыі Сяргей ЗАДЗІРАН**, зараз разглядаецца пытанне аб увядзенні ў нашай краіне электроннай рэгістрацыі суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці.

— Спецыялізаванае падраздзяленне Мінюста ўжо пачало займацца падрыхтоўкай праекта адпаведнага нарматыўнага акта, — адзначыў Сяргей Задзіран. — Сфера паслуг расце, таму наспела неабходнасць зрабіць яе больш даступнай і зручнай для чалавека, зэканоміць яго час. І гэта тычыцца не толькі сферы дзяржрэгістрацыі. Гэта датычыцца і сферы падаткаабкладання, падачы дэкларацый.

Прыйдзе час, калі ў нашай краіне неабавязкова будзе адносіць паперы ў патрэбную інстанцыю. Той, у каго будзе камп'ютар і электронны подпіс, зможа гэта зрабіць, не выходзячы з дому.

### Мінюст прапаноўвае ўдасканаліць заканадаўства ў галіне спорту

З 1 ліпеня мінулага года ў Мінюсце дзейнічае сектар заканадаўства аб моладзевай палітыцы і спорце. Спецыялісты ўжо распрацавалі шэраг прапаноў аб удасканаленні заканадаўства ў галіне прафесійнага спорту.

— Наша рэспубліка з'яўляецца актыўнай удзельніцай алімпійскага руху, спартыўных спаборніцтваў, — кажа Ганна Шпак, — таму заканадаўства ў гэтай сферы трэба развіваць. Што мы, прынамсі, і робім. У прыватнасці, зараз працуем над пытаннем прававога рэгулявання выкарыстання допінгу, адказнасці за схіленне да выкарыстання допінгу. Таксама разглядаецца пытанне аб далучэнні да Еўрапейскай канвенцыі аб папярэджанні гвалту і хуліганскіх паводзін гледачоў падчас спартыўных мерапрыемстваў.

**Надзея ДРЫЛА.**

**АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ**

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Столбцовский райагросервис» (продавец) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ КОМБАЙНА «КЛАСС» Доминатор 108» 2001 г.в.**

**Начальная цена с НДС – 138 448 800 бел. руб.**

Задаток в сумме 10 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **15.03.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.02.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 010,00 | 1 чэшская крона | 169,20 |
| ▲ 1 еўра | 4 110,76 | 1 польскі злоты | 1 046,01 |
| 1 латвійскі лат | 5 835,03 | ▼ 1 расійскі рубель | 102,54 |
| 1 літоўскі літ | 1 189,16 | 1 украінская грыўня | 378,35 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 29,3535 |
| 10 UAH | 36,8878 |
| 1000 BYR | 9,7520 |
| EUR | 40,1350 |

Погляд

# ХАЦЕЛІ ЯК ЛЕПШ...

## А што атрымалася?



**УСХОДНЯЕ партнёрства, гучна абвешчанае ЕС у 2009 годзе, абяцала шасці суседкам — Азербайджану, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне — паляпшэнне і паглыбленне ўзаемаадносін. Задума выдатная. Грунтавалася на чатырох платформах. Дэмакратыя і дзяржкіраванне сумесна з правамі чалавека патрапілі ў першую. Эканамічная інтэграцыя — у другую, энергабяспека — у трэцюю, а кантакты паміж людзьмі, адпаведна, — у чацвёртую. Хутка гаворыцца, ды паціху робіцца... Водгаласу абвешчанага, здаецца, не надта і чуваць. Ва ўсякім разе на гэтым баку. Ці спраўдзіліся ўскладзеныя на праект чаканні? Спрабуем прааналізаваць са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Ігарам КАРПЕНКАМ.**

***— Ініцыятыве Усходняга партнёрства без малога ўжо два гады. Пра якія вынікі можна гаварыць?***

— Калі гаварыць пра рэальны плён, то... сказаць практычна няма чаго! Усё ж такі гутарка вялася ўсё больш у палітычным рэчышчы. Я нават сказаў бы, занадта палітызаваным. І за ўсёй палітычнай балбатнёй загаворваецца галоўнае — рэальнае становішча спраў у нашай краіне. А еўрапарламентарыі галасуюць за рэзалюцыі па Беларусі, давяраючыся сваім калегам, якія маюць аднабокае ўяўленне пра Беларусь. Папросту з-за таго, што падчас сваіх візітаў у нашу краіну праводзяць больш часу з апазіцыяй, чым з намі, афіцыйнымі ўладамі. А пасля нейкія ўмовы, незразумелыя дыскусіі. Хоць Беларусь, вядома ж, чакала рэалізацыі канкрэтных праектаў.

***— Ад еўрапалітыкаў, якія рабілі візіты ў нашу краіну, часта можна было чуць: цяпер мяч на баку Беларусі. Маўляў, ёй варта быць больш ініцыятыўнай. Ці праўда гэта, што Беларусь праявіла сябе інертнай у партнёрстве з ЕС?***

— Ды не была Беларусь пасіўнай! Прапаноў вылучалася насамрэч шмат. Я, натуральна, не магу сказаць за ўсе структуры, але дакладна ведаю пра ініцыятывы ў энергетычным сектары. Багата было прапаноў у эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах.

***— Але за парламенцкае вымярэнне Вы напэўна можаце сказаць...***

— З самага пачатку Беларусь спрабавалі адсунуць ад удзелу ў Еўранэсце. Некаторыя еўрапарламентарыі спрабавалі растлумачыць нам, што ў нас нелігітымны парламент. Шчыра кажучы, пазіцыя дзіўная. Таму што вось астатнія пяць краін-партнёраў лічаць наш парламент легітымным. Аднак іх чамусьці да перамоў па гэтым пытанні не прыцягвалі. І яшчэ адзін цікавы момант: калі мы ў парламенце ратыфікуем нейкія пагадненні з краінамі ЕС па чыста эканамічных пытаннях (аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання, напрыклад), дакументы набываюць юрыдычную сілу. І ніхто не кажа, што іх ратыфікаваў нелігітымны парламент. Дык калі выгадна, беларускі парламент можна лічыць легітымным? Увогуле ўсе размовы ў рамках Усходняга партнёрства вяліся ў неафіцыйным рэчышчы. З намі сустракацца ніхто не жадаў. Узнікае пытанне: ці хацеў наогул Еўрапарламент удзелу Беларусі ў Еўранэсце? А прапанаваны нам фармат «5+5»... Маўляў, палова ад парламента, палова — ад апазіцыі. Я задаваў пытанне, а чаму, напрыклад, не 6 і 4, ці 7 і 3? Хто вырашыў менавіта так структураваць размеркаванне мандатаў у парламенцкім вымярэнні Усходняга партнёрства? І галоўнае, на падставе чаго? У Пражскай дэкларацыі, адзіным афіцыйным дакуменце, пра гэта няма ні слова. Зноў пачынаюцца расплывістыя палітычныя гутаркі: беларускі парламент не прадстаўляе ўвесь спектр палітычных рухаў — у яго складзе няма апазіцыі. Мы таксама можам сказаць, што Еўрапарламент не прадстаўляе ўвесь спектр палітычных сіл. Па-першае, у іх ёсць працэнтны бар'ер, які трэба перасягнуць партыі, каб патрапіць у парламент. Па-другое, яўка на апошніх выбарах была настолькі нізкай (у некаторых краінах яна не перавышала 20 адсоткаў), што пра шырокі спектр меркаванняў грамадства і наогул гаварыць не даводзіцца. Але мы не ставім пад сумненне легітымнасць Еўрапарламента. Абодва гэтыя моманты зафіксаваны ў іх заканадаўстве, і мы ставімся да гэтага паважліва. Чаму ж вы пачынаеце нам дыктаваць умовы? Пазіцыя беларускіх парламентарыяў адзіная: мы гатовы да супрацоўніцтва толькі на паўнапраўнай аснове. Іншыя варыянты непрымальныя. І наша пазіцыя застанецца нязменнай.

***— Стасункі з грамадзянскай супольнасцю, відаць, былі больш актыўнымі...***

— Так, форум грамадзянскай супольнасці ў рамках Усходняга партнёрства правялі. Але ж ад Беларусі туды запрасілі абраных. У рамках Усходняга партнёрства ўвогуле шмат блытаніны. Мноства пытанняў, якія наогул не адпавядаюць палітычнай логіцы. У нас, між іншым, 15 палітычных партый і 2274 грамадскія аб'яднанні. Але ж за мяжой чамусьці выступаюць заўсёды адны і тыя ж людзі. Проста для еўрачыноўнікаў тыя, хто ў нас расколвае грамадства і выводзіць людзей на плошчу, — гэта сапраўдныя структуры грамадзянскай супольнасці. А калі гэта партыі і грамадскія аб'яднанні, якія падтрымліваюць палітычны курс новавыбранага Прэзідэнта, то яны чамусьці ўжо не структуры грамадзянскай супольнасці. А нядаўнія заявы пра еўрафінансаванне беларускай апазіцыі... гэта ўвогуле ні ў якія рамкі міжнароднага права не ўпісваецца! Вы можаце ўявіць, каб нехта з-за мяжы фінансаваў апазіцыйную партыю, напрыклад, у Польшчы? Там такая арганізацыя доўга б не праіснавала. Але ў дачыненні да Беларусі нормы закона ігнаруюцца нашымі суседзямі... А нашым апазіцыйным партыям трэба больш хадзіць да народа, а не ездзіць на Захад з працягнутай рукой!

***— Адносіны па еўрапейскім вектары сёння не назавеш бязвоблачнымі. Што, на Ваш погляд, магло б выправіць сітуацыю?***

— Нам не трэба нічога выпраўляць. А ім... Я рэкамендаваў бы і Захаду, і Усходу змірыцца з тым, што тут, у цэнтры Еўропы, ёсць суверэнная дзяржава, якая хоча, можа і будзе праводзіць самастойную незалежную палітыку. Яна вызначана і структурай нашай эканомікі, і геаграфічным становішчам. І мы не збіраемся ад яе адмаўляцца, незалежна ад таго, хочуць гэтага замежныя краіны ці не. Мы хацелі б, каб з намі гаварылі паважліва і ўлічвалі, што ў нас ёсць свае нацыянальныя інтарэсы. І няма чаго навязваць нейкае меркаванне звонку і проста «пад капірку» ствараць у нас сістэму, аналагічную сваёй. Мы ж ведаем, як некаторыя краіны ўступалі ў ЕС. Як ім дакладна рэгламентавалася, наколькі яны павінны скараціць выпуск сельскагаспадарчай прадукцыі, якія вытворчасці яны павінны звярнуць. Так, нейкія кампенсацыі вылучаліся, але ж негатыўныя наступствы заўважныя. Палітыкам з ЕС трэба правесці рэвізію сваіх палітычных установак і прынцыпаў. У іх саміх праблем хапае. Няхай у сябе спачатку разбяруцца. А тое, што і ў нас ёсць праблемныя пытанні, мы не адмаўляем. І абмяркаваць мы не супраць. Але ж рашэнне будзем прымаць самастойна, а не так, як хочацца ЕС.

***— А на якія-небудзь кампрамісы беларускі бок гатовы?***

— Беларусь заўсёды ішла ў рэчышчы кампрамісаў: не навязвала нікому сваю сістэму каштоўнасцяў. Кожная краіна мае права на свой шлях развіцця. Чаму мы павінны быць як браты-блізнюкі з усімі еўрапейскімі дзяржавамі? У нас склалася свая сістэма, дакладна рэалізуецца прынцып народаўладдзя. Усебеларускі сход, рэферэндумы па ключавых пытаннях — найлепшае таму пацвярджэнне. А ў ЕС што? Паспрабавалі Канстытуцыйны акт на рэферэндум вынесці, не падтрымала насельніцтва. Дык яны вырашылі правесці сваю палітыку ў фармаце пагадненняў: ратыфікавалі іх парламентамі. Дык дзе ж тут народаўладдзе? Тым не менш, мы адкрытыя да супрацоўніцтва — любы палітычны дыялог лепшы за канфрантацыю і дыктат. Аднак увядзенне санкцый не садзейнічае гэтаму супрацоўніцтву.

***— Да чаго такая палітыка можа прывесці?***

— Пужацца няма чаго. Палітыка санкцый бесперспектыўная, і нават сёння яна ўжо выглядае несучаснай. Ну ўвялі ЗША санкцыі супраць двух нашых прадпрыемстваў. І высветлілася, што адно з іх з Амерыкай наогул не працуе, а другое пастаўляе туды толькі пяць адсоткаў сваёй прадукцыі. Хіба праблема пераарыентаваць гэтыя пяць адсоткаў? Так, гэта работа, і не надта простая. Але гэта яшчэ не трагедыя. А ЕС? Ёсць маса іншых рынкаў, апроч яго. Мы вось пачалі актыўна асвойваць паўднёва-амерыканскі ды афрыканскі кантыненты. Дыверсіфікуем пастаўкі. І няма чаго нас торкаць, што мы павінны легчы ці пад Еўрасаюз, ці пад Расію. Ні пад каго мы лажыцца не павінны! Канстытуцыю нашу паглядзіце: прынцып шматвектарнасці ў нас там замацаваны. Мы будзем прытрымлівацца яго і надалей.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС — «ТВАРАСТВАРАЛЬНАЯ» СФЕРА



**ПРАЦЯГВАЕМ абмяркоўваць перспектыўныя накірункі прыкладання прадпрымальніцкай энергіі і ініцыятывы для прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу. Сёння размова нашага карэспандэнта з вядомым эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. Заікам прысвечана развіццю прыдарожнага сэрвісу.**

***— Леанід Фёдаравіч, неаднойчы на высокім узроўні абмяркоўваецца стан і праблематыка прыдарожнага сэрвісу. У парламенце ў час зацвярджэння Міхаіла Мясніковіча на пасадзе прэм'ер-міністра ён не толькі адзначыў актуальнасць гэтай сферы паслуг, але і сказаў, што яна ў пэўнай ступені ўяўляе твар дзяржавы. А таму прыдарожны сэрвіс павінен быць высокага ўзроўню. Падпісаліся бы вы пад гэтымі словамі новага кіраўніка ўрада?***

— Падпісаўся бы. Каму не хочацца, каб наша Беларусь выглядала лепшым чынам у вачах айчынных і замежных аўтападарожнікаў? Але пакуль «твар» гэты не вельмі вясёлы, жывы і, шчыра кажучы, прывабны. Так, я згодны з прэм'ер-міністрам і ў той частцы яго адказу на ўзнятае дэпутатам пытанне, што развіццё прыдарожнага сэрвісу будзе спрыяць росту аказваемых паслуг, аб'ём якіх у аглядаемай будучыні павінен скласці каля 50 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту. Згодны і з тым, што палову гэтага аб'ёму паслуг павінны аказваць прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнэсу. Разам з тым Беларусь, нягледзячы на заклікі і дэкларацыі, не можа пахваліцца развітым прыдарожным сэрвісам.

***— Узнікае пытанне: як і з чаго пачынаць выводзіць яго на міжнародны ўзровень?***

— З павелічэння колькасці прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу ўздоўж галоўных транснацыянальных аўтамабільных магістраляў нашай краіны. Зразумела, узводзіць вялікія палацы не мае сэнсу, а вось стварыць сваю эфектыўную беларускую сферу прыдарожнага сэрвісу — гэта рэальна. А паколькі ён знаходзіцца, па вялікім рахунку, у стадыі станаўлення, варта было б уважліва прыглядзецца да дзвюх асноўных эфектыўных сістэм прыдарожнага сэрвісу — еўрапейскага і паўночнаамерыканскага. Гэта, на мой погляд, дзве найбольш удалыя сістэмы, досвед якіх можна было б творча асэнсаваць, і тое, што нам падыходзіць, укараніць у сябе.

***— Што, напрыклад?***

— Еўропа, як вядома, кантынент пераважна з вялікай шчыльнасцю насельніцтва, асабліва яго заходняя частка. Там прыдарожны сэрвіс — гэта, у асноўным, праз кожныя 40-50 кіламетраў запраўкі, аўтасэрвіс, стаянкі для машын, адпачынку вадзіцеляў, пасажыраў аўтобусаў, прыдарожныя кавярні, рэстаранчыкі, бары, крамы з рознымі карыснымі ў дарозе таварамі першай неабходнасці, абавязкова цывільныя, мушу заўважыць, туалеты. У Еўропе звычайна ўвесь комплекс прыдарожных паслуг ствараецца побач з аўтазапраўкамі. Яно і зразумела: спыніўся чалавек напоўніць бак аўтамабіля, хутчэй за ўсё сам ці яго пасажыры наведаюць аб'ект прыдарожнага сэрвісу: зазірне ў кавярню, у спякотны дзень можа нават асвяжыцца — прыняць душ. Ёсць і такая паслуга на некаторых вялікіх прыпынках.

Таму і ў нас дарожны сэрвіс лепш пачынаць з асваення тэрыторый вакол аўтазапраўчных станцый. Няхай многія з іх маюць пры сабе куткі гандлю харчовай і прамысловай драбязой, гандлярам нафтапрадуктамі не пад сілу (ды і не трэба ім імкнуцца да гэтага) стварыць прыдарожны сэрвіс вакол бензакалонкі. Не іх профіль.

***— Наўрад ці гэтая ідэя прыйдзецца даспадобы гаспадарам заправак.***

— Хутчэй за ўсё, так — навошта ім пад бокам чужыя людзі. Але я прапанаваў бы будаваць непадалёку матэлі, якія выдатна зарэкамендавалі сябе ў многіх краінах. У нас матэляў амаль няма. Сітуацыю трэба рашуча выпраўляць. Сучасны матэль — гэта важны элемент прыдарожнага сэрвісу, які, па сутнасці, з'яўляецца шматфункцыянальнай гаспадаркай, дзе, акрамя недарагога начлегу, вам прапануюць шэраг іншых запатрабаваных падарожнікамі паслуг. У тым ліку і турыстычныя. Як правіла, матэль месціцца ў маляўнічым кутку прыроды, дзе можна нават затрымацца на дзень-другі. Асабліва, калі непадалёку ёсць цікавыя прыродныя, гістарычныя ці архітэктурныя славутасці. Скажам, Мірскі замак. Можна ўзвесці матэль і побач з абласным цэнтрам — ёсць шмат аўтаўладальнікаў, якія не любяць заязджаць у вялікія гарады, а спыняюцца побач у матэлях. Такое суседства з горадам мае шэраг пераваг. Таму для Беларусі, лічу, узвядзенне некалькіх матэляў — перспектыўная справа.

**Ёсць цікавы вопыт замежнай практыкі — аўтобусны партал.**

***— Калі матэль — шматфункцыянальная гаспадарка, як вы гаворыце, то ці пад сілу яе вядзенне нават сярэдняму бізнэсу?***

— Нават малому бізнэсу. Не трэба перабольшваць складанасць задачы. Я веру ў працоўную энергетыку нашых суграмадзян. У Амерыцы быць гаспадаром матэля — пераважна сямейная справа. Тры-пяць чалавек: бацькі і іх дарослыя дзеці, нехта са сваякоў — вось большасць персаналу матэляў, у якіх любяць спыняцца амерыканцы. Я думаю, што і ў нас знойдзецца шмат сем'яў, здольных стварыць не горшыя, а, магчыма, і лепшыя матэлі, дзе заўсёды можна знайсці свабодны нумар з усімі выгодамі, смачную і недарагую ежу.

У розных удзельнікаў дарожнага руху розныя патрабаванні да прыдарожнага сэрвісу. Адны ў сям'і, скажам, з Германіі, якая накіроўваецца праз нашу краіну ў Расію. У дальнабойшчыкаў — іншыя. Для іх галоўнае — бяспечная і абсталяваная стаянка для вялікагрузных машын, якія маюць спальныя месцы. Звычайна іх вадзіцелі начуюць у машыне — дбаюць аб захаванні грузаў. Увогуле дальнабойшчыкі — гэта асаблівая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху, якім трэба хутчэй даставіць груз спажыўцу. А вось аўтатурысты, якіх становіцца ўсё больш, могуць клюнуць на вуду з нажыўкай у выглядзе прапаноў спыніцца на начоўку, застацца на дзень, каб зрабіць экскурсію. Ёсць яшчэ цікавы досвед замежнай практыкі — аўтобусны партал. Сутнасць парталу ў яго магчымасцях аказаць даволі значную колькасць паслуг у час адносна працяглага прыпынку на адпачынак: гандлёвыя кропкі, месцы харчавання, невялікая гасцініца, аптэка, цырульня, інфармацыйна-турыстычнае бюро, кіёскі з сувенірамі і перыёдыкай. Калі шчыльны рух, то там большасць аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу працуе круглыя суткі.

***— І дзе ў нас мэтазгодна было б адкрываць матэлі і аўтобусныя парталы?***

— Вядома, спачатку па накірунках усход-захад і поўнач-поўдзень, дзе назіраецца самы актыўны аўтамабільны рух. Скажам, адзін партал паміж Брэстам і Баранавічамі, другі — паміж Мінскам і Оршай, трэці — побач са сталіцай. У гэтым партале, дарэчы, было б мэтазгодна наладзіць гандаль беларускімі таварамі, у тым ліку і са зніжкамі. Каб пасажыры мелі магчымасць іх набываць, не наведваючы мінскія магазіны. Матэлі, зразумела, будаваць там, дзе будзе гарантыя іх запаўнення. І пажадана там, дзе яны могуць стаць цэнтрамі развіцця малога і сярэдняга бізнэсу. А вось парталы могуць стварацца шляхам дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

***— А як быць са спакусай прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу больш «наварыць» на сваіх паслугах?***

— Людзей можна зразумець: многім трэба вяртаць пазычаныя на развіццё бізнэсу грошы ў сяброў, сваякоў, разлічвацца па банкаўскіх крэдытах. Але я думаю, што цэны на паслугі прыдарожнага сэрвісу спачатку павінны быць сацыяльна прымальныя, каб паступова ў гаспадара таго ці іншага аб'екту на дарозе назапашвалася свая кліентура. Каб дальнабойшчыкі перадавалі адзін аднаму: вось там можна смачна і адносна нядорага паабедаць, а вось там — зручна і бяспечна пераначаваць. На мой погляд, сярэдні кошт начоўкі не павінен быць больш чым 10 еўра ў эквіваленце.

***— Магчыма, параўноўваць наш ненавязлівы прыдарожны сэрвіс, які толькі пачынае дзейнічаць, з Еўропай і ЗША не зусім карэктна, а вось з суседнімі краінамі варта. Ва Украіне, бадай, самая знакамітая дарога — аўтамагістраль Кіеў-Адэса, якая добра вядома многім тысячам беларусаў. Ці можна выкарыстаць гэты вопыт?***

— Не ва ўсім. Ва Украіне ўздоўж асноўных магістраляў цэны на паслугі часам «куслівыя». Прыняцце душа можа каштаваць аж 8 долараў — усяго за максімум 10 хвілін карыстання душавой кабінкай. Але, з іншага боку, уражваюць сваёй вынаходлівасцю прадпрыемствы грамадскага харчавання з нацыянальным каларытам. Прывабна і інтрыгуюча гучаць назвы кавярняў і невялікіх рэстаранаў паабапал курортнай трасы Кіеў—Адэса. Скажам, у рэстаране пад смачнай назвай «Сала» ўсе (ці амаль ўсе) стравы прыгатаваны з гэтага сусветна вядомага ўкраінскага далікатэса ці на яго аснове. Стомленаму сонцам і дарогай падарожніку з сям'ёй прыемна завітаць на абед у рэстаран «Борщ» і паласавацца сапраўдным украінскім баршчом — згодна са старажытнымі рэцэптамі, як кажуць афіцыянты. Ці на вячэру ў кавярні «Варэнікі» або «Галушкі» і г. д. Чым не прыклад удалага выкарыстання асаблівасцяў нацыянальнай кухні, яе брэндаў для нашага малога і сярэдняга бізнэсу? Бо гэта, лічу па сабе, вабіць больш, чым традыцыйнае шматгадовае меню звычайнай сталоўкі.

***— Дзяржава неаднойчы заяўляла (у тым ліку і вуснамі цяперашняга прэм'ер-міністра), што гатовая ўзяць на сябе частку выдаткаў па развіцці прыдарожнага сэрвісу. Яшчэ папярэдні ўрад вырашыў пры рэканструкцыі магістраляў за дзяржаўныя сродкі развіваць транспартную інфраструктуру для прыдарожнага сэрвісу. Аднак чаму малы і сярэдні бізнэс не спяшаецца ўдзельнічаць у стварэнні аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу?***

— Прадпрымальнікам не хапае інфармацыі. Мясцовым органам улады спачатку трэба вызначыць перспектыўныя месцы развіцця прыдарожнага сэрвісу і загадзя падвесці туды ваду і электрычнасць. Без гэтага не атрымаецца забяспечыць сучасны ўзровень абслугоўвання. Затым з улікам патрабаванняў часу пабудаваць зручныя паркоўкі, пад'езды да аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Бо гэта для малога і сярэдняга бізнэсу вельмі дарагое задавальненне. Тут надзея толькі на дзяржаву. Зварухнуць справу можа выдаткаванне сродкаў з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на садзейнічанне стварэнню прыдарожнага сэрвісу.

Думаю, што не ўсе прадпрымальнікі ведаюць, як правільна пачынаць уласную справу на дарозе. І тут было б дарэчы саюзам прадпрымальнікаў сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі структурамі, напрыклад, міністэрствам транспарту і камунікацый, наладзіць аўтобусны тур нашых бізнэсменаў-пачаткоўцаў для знаёмства з лепшым досведам прыдарожнага сэрвісу ў адной з суседніх краін. Можна было б правесці шэраг рэгіянальных канферэнцый па тэматыцы прыдарожнага сэрвісу з наступным іх асвятленнем у СМІ. Ёсць і прычыны псіхалагічнага характару — у нас такі сэрвіс часта ўспрымаецца як наяўнасць запраўак з буфетам і кіёскам ці дробнай кавярні на дарозе са сціплым выбарам не заўсёды свежых і смачных страў. Калі так падыходзіць, то я не ведаю, у якой перспектыве прыдарожны сэрвіс зможа істотна паўплываць на рост аб'ёму паслуг, якія аказваюць прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнэсу.

Сапраўды, прыдарожны сэрвіс — «тварастваральная» сфера. Ад яго ўзроўню ў многім будзе залежаць успрыманне ў вачах айчынных і замежных аўтападарожнікаў нашай краіны.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

**Местный фонд**
**«Правопорядок Заводского района г. Минска»**

*зарегистрирован решением управления юстиции Минского горисполкома 19.07.2006 г. № 00043 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 194900098.*

**Место нахождения Фонда:**
**220026, г. Минск, ул. Жилуновича, д. 17, комн. 26.**

Учредителем Фонда является администрация Заводского района г. Минска.

**Стоимость имущества Фонда 5300000 руб.**

Доходы фонда:

- безвозмездная (спонсорская) помощь от предприятий, организаций района;

- целевые поступления от организаций и предприятий района на содержание добровольных дружин и другие цели, указанные в Уставе Фонда.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на осуществление деятельности, направленной на содействие по обеспечению правопорядка и достижение общественно-полезных целей, указанных в Уставе Фонда 68609049 руб.

Количество УП, других хозяйственных обществ, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе участия Фонда в таких юридических лицах — не участвует, не создавались.

**ЗАВЕРЕНО**
Директор Департамента
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
04.02.2011 г.

ТЕХНОБАНК

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол Наблюдательного
Совета ОАО «Технобанк»
21.12.2010 № 47

**КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ**

**ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ШЕСТОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ТЕХНОБАНК»**

**1. Наименование.**

На белорусском языке:

полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Тэхнабанк», сокращенное – ААТ «Тэхнабанк».

На русском языке:

полное – Открытое акционерное общество «Технобанк», сокращенное – ОАО «Технобанк».

**2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.

Тел./факс: +375 17 283 15 05

Адрес в интернете: www.technobank.by

E-mail: info@technobank.by

**3. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**

№ 3811800010014 в ОАО «Технобанк», код 182 (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, не являющихся банками).

№ 1811800010016 в ОАО «Технобанк», код 182 (для банков).

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.**

Годовая бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО «Технобанк» по адресу: www.technobank.by.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**

ОАО «Технобанк» обслуживает депозитарий ОАО «Технобанк», расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385568, выданного Министерством Финансов Республики Беларусь, срок действия – до 22 июня 2014 года.

**6. Размер уставного фонда.**

Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет 46 586 939 800 (Сорок шесть миллиардов пятьсот восемьдесят шесть миллионов девятьсот тридцать девять тысяч восемьсот) белорусских рублей.

Уставный фонд разделен на 24 519 442 (Двадцать четыре миллиона пятьсот девятнадцать тысяч четыреста сорок две) акции, из них простых (обыкновенных) акций 24 455 229 (Двадцать четыре миллиона четыреста пятьдесят пять тысяч двести двадцать девять) штук и привилегированных акций 64 213 (Шестьдесят четыре тысячи двести тринадцать) штук. Номинальная стоимость акций – 1 900 (Одна тысяча девятьсот) рублей.

**7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как ООО СКБ «Технобанк» 5 августа 1994 года, регистрационный номер № 47, преобразован в ОАО СКБ «Технобанк» 1 июня 1995 года, переименован в ОАО «Технобанк» 5 мая 2000 года. ОАО «Технобанк» (далее – Банк) является правопреемником всех прав и обязанностей ЗАО «Торгово-Промышленный банк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**

Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:

- в офисе ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни;

- на интернет-сайте эмитента: www.technobank.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Технобанк» «21» декабря 2010 года, протокол № 47.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**

К открытой продаже предлагаются 200 000 (Двести тысяч) именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).

Серия «ТБ-6», номера «000001 – 200000».

Объем эмиссии составляет 20 000 000 000 (Двадцать миллиардов) белорусских рублей.

**11. Номинальная стоимость облигаций.**

100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

**12. Цель выпуска облигаций.**

Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы банка.

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

**14. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь.**

Выпуск облигаций осуществляется в пределах восьмидесяти процентов от суммы нормативного капитала эмитента по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от «24» января 2011 года № 25).

**15. Период проведения открытой продажи облигаций.**

Дата начала продажи: 21 февраля 2011 года.

Дата прекращения продажи: 21 июля 2011 года.

**16. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**

Открытая продажа (размещение) осуществляется:

- на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни на основании договора первичного размещения облигаций;

- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

**17. Срок обращения облигаций.**

с 21 февраля 2011 года по 21 февраля 2012 года (365 дней).

**18. Условия и порядок досрочного выкупа.**

Эмитент обязуется произвести досрочный выкуп облигаций у их владельцев по текущей стоимости 22.08.2011 г. и 21.11.2011 г.

Для продажи облигаций эмитенту владельцы облигаций подают заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:

- наименование владельца облигаций;

- номер и дату регистрации ценной бумаги;

- количество облигаций, предложенных для продажи;

- юридический адрес, банковские реквизиты и контактные телефоны заявителя;

- наименование профессионального участника ценных бумаг, который будет осуществлять продажу облигаций в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (в случае продажи облигаций на биржевом рынке).

Заявление должно быть подписано уполномоченным лицом владельца облигаций и скреплено печатью.

Заявление передается эмитенту по факсу (с последующим предоставлением оригинала) не позднее семи календарных дней до даты выкупа облигаций эмитентом по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, тел./факс +375 (17) 283-15-05.

**19. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций.**

Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 в ОАО «Технобанк» с 9.00 до 16.00 в рабочие дни, начиная с 21 февраля 2012 года.

Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.

Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО «Технобанк», сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**20. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.**

Цена продажи облигаций в период открытой продажи устанавливается эмитентом из расчета 14 % годовых к погашению.

Годовая доходность по облигациям рассчитывается по следующей формуле:

$$Дг = \frac{(Н–Ц) \times 100}{Ц} / \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:

Дг – годовая доходность по облигациям (процентов годовых);

Н – номинальная стоимость облигаций;

Ц – цена продажи облигаций;

Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Количество дней до погашения облигаций определяется со дня их продажи по день погашения. При этом день продажи и день погашения считаются одним днем.

Текущая стоимость облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times Д}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:

С – текущая стоимость облигаций;

Ц – цена продажи облигаций, установленная эмитентом в день начала открытой продажи;

Д – доходность, рассчитанная исходя из цены продажи на дату начала размещения облигаций (процентов годовых), установленная эмитентом;

Т – количество дней обращения дисконтных облигаций данного выпуска. Количество дней обращения дисконтных облигаций определяется с даты начала их размещения по дату расчета их текущей стоимости. При этом день начала размещения дисконтных облигаций и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем;

Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Расчет цены продажи и текущей стоимости облигаций осуществляется исходя из фактического количества дней в году.

При расчете количества дней срока обращения (до погашения) и периода начисления дохода первый и последний дни срока (периода) считаются одним днем. При этом, если срок (период) делится переходом с календарного года, состоящего из 365 дней, на календарный год, состоящий из 366 дней, либо наоборот, то при определении значений Т365 и Т366 уменьшается количество дней в первой части периода независимо от количества дней в календарном году.

При определении текущей стоимости и цены продажи облигации, расчет дохода производится по каждой облигации с точностью до одного рубля.

Облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости и погашаются по номинальной стоимости.

Доходом у держателя облигаций является дисконт, который в случае приобретения облигаций до погашения рассчитывается по формуле:

$$Д = Н - Ц,$$

где:

Д – дисконт (доход);

Н – номинальная стоимость облигаций;

Ц – цена покупки облигации.

В случае досрочного выкупа облигаций эмитентом доход рассчитывается по формуле:

$$Д = Цв - Ц,$$

где:

Д – дисконт (доход);

Цв – цена выкупа эмитентом;

Ц – цена покупки облигации.

**21. Минимальная цена продажи облигаций.**

87 723 (Восемьдесят семь тысяч семьсот двадцать три) белорусских рубля.

**22. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций.**

При запрещении выпуска облигаций эмитент в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении выпуска облигаций возвращает инвесторам средства, полученные в оплату размещенных облигаций.

**23. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций.**

Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Эмитент имеет право продавать на вторичном рынке выкупленные ранее облигации по договорным ценам.

Эмитент имеет право досрочно погасить выкупленные облигации с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь.

Эмитент имеет право совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Конвертация облигаций не производится.

**24. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**

№ 5-200-02-0985 от «04» февраля 2011 года.

**Председатель Правления** **Д.Л. Михалевич**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010 г.*

